# I (ШКОЛЬНЫ) ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”

**IX клас**
**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

## ДАВЕДКІ

*Кастрычік 2024 г., Гродна*

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **5** | **5** | **5** | **5** | **5** | **5** | **5** | **5** | **5** | **5** | **50** |

*!!! Пры праверцы заданняў за кожную дапушчаную арфаграфічную, граматычную, пунктуацыйную памылку здымаецца 0,1 бала, калі не ўказаны іншыя ўмовы.*

**Заданне 1.** *Максімальная колькасць балаў – 5; 1 б. за правільны адказ*

| Словы | Транскрыпцыя |
|---|---|
| 1) перад хатай | [п’эрат ха́тай] |
| 2) ва Уруччы | [ва ўру́ч̄ы] |
| 3) клятчатка | [кл’ач̄атка] |
| 4) да Ігната | [да йгна́та] |
| 5) яечня | [йайэ´чн’а] |

**Заданне 2.** *Максімальная колькасць балаў – 5; 1 б. за правільны адказ*

| | |
|---|---|
| вострая сатыра | вострасатырычны |
| дробны маштаб | дробнамаштабны |
| тонкія бровы | танкабровы |
| глыбокія думкі | глыбакадумны |
| просты народ | простанародны |

**Заданне 3.** *Максімальная колькасць балаў – 5; 0,5 б. за кожную пазіцыю*

| Сказы | Тлумачэнне |
|---|---|

| | |
|---|---|
| 1. Як на добры розум, трэба было пачакаць якой паўгадзіны, пакуль не растане град *(У. Шахавец).* | ‘разважаючы (робячы) спакойна, цвяроза, разумна’ |
| 2. Ці ў сваім ты розуме? Хто гэта садзіць бульбу ў скрынках? Гэта ж не расада якая… *(А. Якімовіч)* | ‘пра чалавека ў ненармальным псіхічным стане’ |
| 3. Чаго вы чапляеце хлопца!.. Дайце яму жыць сваім розумам *(І Шамякін).* | ‘быць самастойным у сваіх дзеяннях, учынках, прытрымлівацца сваіх поглядаў’ |
| 4. Але мужык заўсёды заднім розумам хітры, – праўда, Шчасны? – звярнуўся да вартаўніка Войцік *(М. Машара).* | ‘пра чалавека, які няздольны своечасова прыняць патрэбнае рашэнне’ |
| 5. І дзе ні пойдзе Іванка, – людзі там розуму ад яго набіраюцца ды з ліхімі панамі змагаюцца *(А. Якімовіч).* | ‘станавіцца разумнейшым, дасведчаным’ |

**Заданне 4.** *Максімальная колькасць балаў – 5; 1 б. за правільна ўтворанае і запісанае словазлучэнне*

1) …каб з яе смяяліся.
2) … ажаніцца з Верачкай.
3) дзве дзявочыя…
4)…выбачайце нам…
5) …паслаць па доктара.

**Заданне 5.** *Максімальная колькасць балаў – 5; 0,5 б. за кожны правільна ўтвораны радок*

| 1. Прыставачна-суфіксальным | 2. Суфіксальным |
|---|---|
| а) дах – паддашак | а) гітара – гітарыст |
| б) сцяна – прысценак, прысценны | б) скрыпка – скрыпач |
| в) колер – бясколерны | в) цымбалы – цымбаліст |
| г) надворак – знадворку | г) дуда – дудар |
| д) сядзіба – прысядзібны | д) барабан – барабаншчык |

*!!! Калі вучні запісалі іншы варыянт, праверыць па словаўтваральным слоўніку.*

**Заданне 6.** *Максімальная колькасць балаў – 5*

| Назва прадукцыі па-руску | Пераклад |
|---|---|
| комод “Антарио” | камода “Антарыа” |
| шкаф “Шекспир” | шафа “Шэкспір” |
| диван “Юпитер” | канапа “Юпітэр” |
| зеркало “Токио” | люстэрка (люстра) “Токіа” |
| сундук “Секрет” | куфар “Сакрэт” |

**Заданне 7.** *Максімальная колькасць балаў – 5*

1. Янка Купала ў вершы “Кароль”, каб стварыць сюжэтны малюнак выкарыстаў шэраг гукаперайманняў. Ваша задача ўзнавіць каму належаць тыя ці і ншыя гукі. *(0,5 б. за кожны правільны адказ)*

Толькі часам мм-у, мм-у! –
    Замычыць **цялятка**;
Бэ-э, мэ-э! Бэ-э, мэ-э! –
    Забляе **ягнятка**.

Рох-рох, цох-цох! Кві-кві, кві-кві! –
    Пісьне **парасятка**,
Ды гі-гі-гі? – адыржэцца
    Недзе **жарабятка**.

Куку-куку! Куку-куку! –
    Кукуе **зязюля**;
Піць-піць! Піць-піць! – **каня** кліча,
    Як бы после гуляў.

Ву-ву! Ву-ву! – загудзеў **жук**
    Каля вуха смела;
Ззынь-ззынь! Ззынь-ззынь! – з мёдам з кветкі
    **Пчолка** зазвінела.

2. Запішыце беларускамоўны адпаведнік англійскага гукаперайманне *cock-a-doodle-doo* _**кукарэку (дапускаецца запіс “ку-ка-рэку”)** (1 б.)

**Заданне 8.** *Максімальная колькасць балаў – 5; 1 бал за кожны сказ*

1. Мой лепшы сябар, Касцік, займаецца ў спартыўным клубе. ***<u>(адасобленым прыдаткам)</u>***

2. Спякота прымусіла нас, нарэшце, схавацца ў цяньку. ***(пабочным словам*** 3. Эх, час касьбы, вясёлы час! І я з ім цешыўся не раз. ***(звароткам)***
4. Міхал – навошта ўжо таіцца? – любіў-такі павесяліцца. ***(устаўным сказам)***
5. Дзесьці высока-высока, за самымі хмарамі, курлыкалі журавы. ***(адасобленай акалічнасцю)***

**Заданне 9.** *Максімальная колькасць балаў – 5*
!!! *Балы налічваюцца за цалкам правільны адказ*
АДКАЗ: 1-В-М ; 2-Д-З; 3-Г-Н; 4-Б-Л; 5-А-К

**Заданне 10.** *Максімальная колькасць балаў – 5*
1) Гродзенская паэтка Алена Руцкая нарадзілася на Слонімшчыне. (**не**, Шчучыншчыне)
2) У Гродна ёсць помнік Янку Купалу. (**так**, каля ўніверсітэта)
3) Уладзімір Караткевіч працаваў у газеце “Гродзенская праўда” (**не**)
4) Абласная бібліятэка носіць імя Івана Насовіча. (**не**, Карскага)
5) Янка Брыль нарадзіўся на Карэліччыне, працаваў у раённай газеце ў Міры. (**так**)
6) Васілю Цяпінскаму пастаўлены помнікі ў Лідзе. (**не**, Ф.Скарыне)
7) У 1775-1802 гг. у г. Гродна дзейнічала “Каралеўская друкарня”, яе уладальнікам быў Антоній Тызенгаўз? (**так**)
8) У цэнтры г. Гродна ёсць дом-музей Максіма Багдановіча. (**так**)
9) Васіль Быкаў у Гродна пражыў 25 гадоў. (**так)**
10) Кінастужку па творы Міхася Лынькова “Міколка-паравоз” здымалі ў г.Гродна. (**так**)